# СВАБОДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

№ 34 (49), 21.12.2006–3.1.2007 г.


# ГОД 2006

## ЯКІМ ЁН ЗАСТАНЕЦЦА Ў ПАМЯЦІ?




*19 сакавіка 2006 году, адразу пасля прэзідэнцкіх выбараў, на Кастрычніцкай плошчы сабраўся шматтысячны мітынг пратэсту супраць іх фальсіфікацыі. Потым моладзь чатыры дні трымала абарону ў намётавым гарадку. Усе ўдзельнікі былі кінутыя ў турмы.*

*Напярэдадні Новага году на Кастрычніцкай плошчы нішто не нагадвае пра вясновае процістаянне. Тым не менш, ясна, што яно застанецца галоўнай падзеяй гэтага году. А што можна сказаць пра ўсе астатнія падзеі?*

*Адказ — на* *стар. 2*



## ВЫБАРЫ-2007

### ХТО, ДЗЕ, КОЛЬКІ?

► СТАР. 4

## ПОМНІК ЧЫКАЦІЛУ

### ЭСЭ АЛЕГА АБЛАЖЭЯ

► СТАР. 7

# ЯКАЯ ПАДЗЕЯ 2006 ГОДУ БЫЛА, НА ВАШУ ДУМКУ, НАЙМЕНШ ЗНАЧНАЙ?

**АРТУР КЛІНАЎ, МАСТАК:**

## "ТОП-ДЗЯСЯТКА ГЛАМУРНЫХ АСОБАЎ"

Сёлета такі хіт-парад арганізоўвалі. Як яго, не "Плэйбой года"... Топ-дзясятка гламурных асобаў. Абсалютна нейкае лажовае мерапрыемства. Хатнія радасці нашых папсавікоў. Гэта першае, што прыходзіць у галаву.

**ВАСІЛЬ, ЛЕКАР:**

## "ВЫБАРЫ ЛУКАШЭНКІ"

Выбары Лукашэнкі Рэспублікі Беларусь. Я маю на ўвазе не тое, што адбылося пасля іх, а самі выбары. З заведама вызначаным вынікам.

**АНДРЭЙ КУДЗІНЕНКА, КІНАРЭЖЫСЁР:**

## "ВЫСТУП БРАЗІЛЬСКІХ ФУТБАЛІСТАЎ"

Выступ зборнай Бразіліі на Чэмпіянаце свету па футболе. А з беларускіх падзей магу назваць святкаванне Дня Волі. Мілінкевіч праявіў сябе прыкладна так, як і Ранальдзіньё, ад якога шмат чакалі на тым чэмпіянаце…

**УЛЬЯНА, НАСТАЎНІЦА:**

## "АДКРЫЦЦЁ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ"

Я жыву ў мікрараёне "Ўсход". Таму для мяне такой падзеяй з'яўляецца адкрыццё Нацыянальнай бібліятэкі. Колькі было помпы і надзімання шчок, і што атрымалася? На карцінцы быў шэдэўр з залатога шкла. А атрымаўся помнік слоіку для закаткі агуркоў.

**ВІКТАР ШАЛКЕВІЧ, АКЦЁР:**

## "СКАНДАЛ ВАКОЛ РЭКАНСТРУКЦЫІ ЦЭНТРУ ГРОДНА"

Гэты скандал быў раздзьмуты ў прэсе. Мне вельмі падабаецца тое, што ў Гродне зараз працуе Фарны касцёл. Адкрыўся цэлы езуіцкі комплекс. І, мне здаецца, грамадскасць неінфармаваная. Маса гісторыкаў і археолагаў сачылі за гэтым усім. І тое, што зроблена, мне падабаецца.

**ДЗМІТРЫ, МУЗЫКА:**

## "З'ЕЗД САЮЗА КАМПАЗІТАРАЎ"

З'езд Саюза кампазітараў Беларусі. На ім у соты раз перааб-ралі старшынём Ігара Лучанка.

**ЛЯВОН БАРШЧЭЎСКІ, ЛІТАРАТАР:**

## "СТВАРЭННЕ НОВАГА САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ"

Найменш значнай падзеяй з'яўляецца стварэнне новага Саюза пісьменнікаў на чале з Чаргінцом. Гэта абсалютна прагматычная структура, дзе проста разлічваюць на дзяржаўную датацыю. Творчыя пытанні там нікога не цікавяць. А тым больш, выхад на нейкую сусветную арэну. Гэта спроба захапіць касу і падзяліць яе паміж часткай людзей, якія пішуць. Прычым, не самай лепшай часткай. Такі невялікі абшчак, кажучы крымінальным жаргонам. Праўда, Віктару Шніпу ўдалося выдаць, дзякуючы гэтаму СП, кніжку ў такім афармленні, у якім яго ніколі не выдавалі. Нешта яму дасталося.

**ВАЛЯНЦІНА, НАСТАЎНІЦА:**

## "ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ ПРАВАДЫРА"

Дзень нараджэння Аляксандра Лукашэнкі. Здаецца, усе ведаюць, калі ён нарадзіўся. У мінулыя гады гэтая светлая дата неяк адзначалася. Ці па радыё што скажуць, ці які губернатар кветкі падорыць. А сёлета неяк ціха было 30 жніўня. Сціплы стаў наш правадыр, атрымаўшы пажыццёвы тэрмін.

**ЛЯВОН ВОЛЬСКІ, РОК-МУЗЫКА:**

## "КОНКУРС "ЕЎРАБАЧАННЯ"

Удзел Беларусі ў конкурсе "Еўрабачання" – абсалютна нязначная ні для каго падзея. Пры такой пільнай увазе ўсіх афіцыйных СМІ, яна стала поўным нічым. Альбо ўсе гэтыя дзіцячыя конкурсы "Еўрабачання"… У нас да гэтага стаўленне, як да спорту. у нас да ўсяго стаўленне, як да спорту. Да культуры ў тым ліку. Мы будзем скакаць высока і пры гэтым спяваць, і тады ў нас усё атрымаецца. А ў выніку нічога не атрымліваецца, і, можа, не варта гэтым было займацца. І выдаткоўваць такія значныя сумы на ўсё гэта, замест таго, каб займацца рэстаўрацыяй помнікаў культуры – да прыкладу, сярэднявечных замкаў, якія развальваюцца, бо стаяць незакансерваваныя.

**МІХАІЛ, СТУДЭНТ:**

## "БЕЛКА", ЯКАЯ ЛЯСНУЛАСЯ"

Самая нязначная падзея сёлета – "БелКА", якая ляснулася. Гора ад гэтай катастрофы няшмат. І радавацца, здаецца, неяк непрыстойна. Усё ж маглі стаць касмічнай дзяржавай. А так – палёты да зор адкладваюцца.

**АЛЯКСАНДР, ПРАДПРЫМАЛЬНІК:**

## "ПРАЙГРАНЫ КОНКУРС НА ПРАВЯДЗЕННЕ ХАКЕЙНАГА ЧЭМПІЯНАТУ"

Мінск сёлета мог выйграць конкурс на правядзенне ў Беларусі міжнароднага хакейнага чэмпіянату. Але не выйграў. Дробязь, вядома, але прыемная дробязь. Няма чаго тут ладзіць вялікія міжнародныя спаборніцтвы.

**АНАТОЛЬ ЛЯБЕДЗЬКА, ПАЛІТЫК:**

## "САМІТ СНД"

Гэта саміт СНД, які праходзіў у Мінску. Яго заўважылі толькі аўтааматары, якім цяжка было рухацца па вуліцах сталіцы. Не адпавядае тая рэклама, якая была, таму, што адбылося падчас гэтай падзеі.



**16 снежня** *адбылася традыцыйная акцыя салідарнасці з палітзняволенымі і сем'ямі зніклых. Напярэдадні ў Мінскім гарадскім судзе разглядалася касацыйная скарга на прысуд Змітру Дашкевічу, які атрымаў два гады турмы. Суд адмовіўся пераглядаць прысуд. На здымку: сябры Дашкевіча па незарэгістраваным Маладым фронце праводзяць акцыю салідарнасці ля будынку гарадскога суда. Мінск, 15 снежня 2006 году.*



**Пахаванне пісьменніка** *Івана Навуменкі. Мінск, 19 снежня 2006 году.*

# РАЗВІТАННЕ З ІВАНАМ НАВУМЕНКАМ

Іван Навуменка нарадзіўся 16 лютага 1925 году ў Васілевічах на Гомельшчыне. Стаў празаікам-раманістам, аўтарам кніг "Сасна пры дарозе", "Вецер у соснах" ды многіх іншых. Як дырэктар Інстытута літаратуры напісаў кнігі пра Купалу, Коласа, Багдановіча... Навуменка – адзіны народны пісьменнік Беларусі, які атрымаў гэтую годнасць ад А.Лукашэнкі. Аднак Навуменка не прыняў палітыкі першага прэзідэнта, пра што сведчыць яго рашучая адмова перайсці з Саюзу беларускіх пісьменнікаў у ідэалагічны саюз генерала Чаргінца. Пасля смерці Быкава, Шамякіна, Навуменкі, у беларусаў застаюцца толькі два народныя песняры – Рыгор Барадулін і Ніл Гілевіч.

# Суседзі

## МОНІЧ: Я НЕ ШПІЁН

### БЕЛАРУСКІ АГЕНТ СПРАБАВАЎ ВЫВЕДАЦЬ ПОЛЬСКІЯ САКРЭТЫ?



**Сяргей Моніч**

Грамадзянін Беларусі Сяргей Моніч заявіў у літоўскім судзе, што ён не з'яўляецца шпіёнам і папрасіў не выдаваць яго Польшчы, дзе супраць яго вылучаныя абвінавачанні ў шпіянажы.

Моніча, які быў затрыманы службамі бяспекі Літвы і Польшчы сёлета 25 лістапада, падазраюць у спробе завербаваць польскага дыпламата з мэтай атрымліваць інфармацыю з польскага Міністэрства замежных справаў. Аб гэтым заявіла ў судзе прадстаўніца абвінавачання Разіта Пацарскене. Паводле яе словаў, маюцца дакументы, якія даводзяць, што Моніч сёлета ў ліпені двойчы сустракаўся з сваім агентам у Празе і прапаноўваў яму грошы ў абмен на імёны польскіх дыпламатаў.

Дарэчы, у прэсе раней паведамлялася, што Моніч выступаў з ініцыятывай адкрыць у сталіцы Чэхіі беларускую школу.

Абвінаваўца з польскага боку Януш Качмарэк раней заявіў, што затрыманы дзейнічаў «супраць польскіх інтарэсаў у галіне эканомікі і абароны цягам доўгага перыяду».

Гэта першы выпадак арышту беларускага шпіёна пасля таго, як у Беларусі цягам некалькіх гадоў спецслужбы заяўлялі аб раскрыцці шпіёнскай або дывэрсійнай дзейнасці дыпламатаў Турцыі, Польшчы, Чэхіі і Латвіі.

**Паводле СМІ**
**Фота R.Jurgaitis**

# ЦЭНТРВЫБАРКАМ: "УСЕ КАНДЫДАТЫ МАЮЦЬ РОЎНЫЯ ПРАВЫ"

## АПАЗІЦЫЙНЫЯ ПАРТЫІ Ў ГЭТЫМ СУМНЯВАЮЦЦА

*На 14 студзеня 2007 году прызначаныя выбары ў мясцовыя Саветы. Зараз у Беларусі праходзіць агітацыйная кампанія . Яна стартавала 15 снежня пасля атрымання прэтэндэнтамі ў Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў рэгістрацыйных пасведчанняў кандыдатаў у дэпутаты.*

### АГІТАЦЫЯ – АДЗІН РАЗ І ДА ПЯЦІ ХВІЛІН

Як зазначыў у інтэрв'ю БелаПАН сакратар Цэнтрвыбаркама Мікалай Лазавік, падчас гэтай кампаніі перадвыбарныя друкаваныя агітацыйныя матэрыялы будуць вырабляцца толькі на тэрыторыі Беларусі, што дазволіць устанавіць неабходны кантроль за расходаваннем грашовых сродкаў, вылучаных з дзяржаўнага бюджэту. Ён нагадаў, што такая норма ўтрымліваецца ў прынятых змяненнях і дапаўненнях да выбарчага заканадаўства. «У выпадку калі для агітацыі і прапаганды будуць выкарыстаныя асабістыя грашовыя сродкі або сродкі замежных спонсараў, кандыдат пазбаўляецца рэгістрацыйнага пасведчання», — сказаў М.Лазавік.

Апрача таго, зменены парадак правядзення сустрэч кандыдатаў з выбаршчыкамі -- сходы, што праходзяць паза памяшканнямі з мэтай агітацыі, аднесены да кампетэнцыі закона «Аб масавых мерапрыемствах». Яны павінны быць дазволеныя мясцовай адміністрацыяй.

Для вырабу агітацыйнай прадукцыі кандыдатам у дэпутаты Мінскага гарадскога і абласных саветаў выдзяляецца па 8 базавых велічыняў, гарадскіх і раённых саветаў -- па 4 базавыя велічыні. Кандыдаты ў дэпутаты пярвічных (сельскіх) саветаў атрымаюць па 1 базавай велічыні.

Агітацыйная кампанія будзе працягвацца да 13 студзеня 2007 году.

«Усе зарэгістраваныя кандыдаты маюць роўныя правы і абавязкі. Пры жаданні на перыяд агітацыі і прапаганды яны могуць браць адпачынак – альбо чарговы, альбо без захавання заробнай платы", — сказаў М.Лазавік.

Пры правядзенні агітацыі ў кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў менш магчымасцяў, чым у прэтэндэнтаў на крэслы ў Палаце прадстаўнікоў, якія выступаюць па тэлебачанні, публікуюць свае праграмы ў газетах. Паводле пастановы Цэнтрвыбаркама кандыдаты ў дэпутаты абласных, Мінскага гарадскога, раённых, гарадскіх у гарадах абласнога падпарадкавання Саветаў маюць права на адно бясплатнае выступленне па мясцовым дзяржаўным радыё. Працягласць выступлення – да 5 хвілін. У Мінску і Мінскай вобласці гэтыя звароты да выбарцаў трансліруе радыёстанцыя "Сталіца", а ў астатніх абласцях – раённыя і гарадскія радыёканалы. Яны перадаюцца ў запісу.

### ДЗЕ ХТО БАЛАТУЕЦЦА

На 22 658 дэпутацкіх мандатаў на гэтых выбарах прэтэндуюць 23 719 кандыдатаў. Хаця некаторыя партыі, у тым ліку са складу аб'яднанай апазіцыі, гэтым разам вырашылі выбары байкатаваць, ад апазіцыі зарэгістраваныя больш за 200 кандыдатаў .

Партыя камуністаў беларуская (ПКБ) зарэгістравала 50 кандыдатаў, хаця на з'ездзе ПКБ было вырашана зняць сваіх кандыдатаў з выбараў.

Партыя БНФ зарэгістравала кандыдатамі ў дэпутаты каля 100 сваіх прыхільнікаў са 132-х. Аб'яднаная грамадзянская партыя – 61.

Найбольшая канкурэнцыя, як заўсёды, у сталіцы — на 55 акругаў зарэгістравалі 168 кандыдатаў. Сярод вядомых апазіцыянераў тут балатуюцца Вінцук Вячорка, Анатоль Лябедзька, Уладзімір Нісцюк, Ігар Шынкарык.

У 22-ой Голубеўскай акрузе ў Мінскі гарсавет другі раз балатуецца Сяргей Альфер. У адной акрузе з Ігарам Шынкарыкам балатуецца былы першы намеснік старшыні Дзяржкантролю Міхаіл Матусевіч, з Уладзімірам Нісцюком — цяперашні дэпутат гарсавету Уладзімір Краўчанка, з Вінцуком Вячоркам — супрацоўніца раённай адміністрацыі спадарыня Шылай. Анатолю Лябедзьку дасталіся малавядомыя канкурэнты.

У іншых мясцовых саветах найбольшая канкурэнцыя (у сярэднім амаль два чалавекі на месца) на выбарах у Брэсцкі гарадскі савет дэпутатаў.

На 40 акругаў у Брэсце зарэгістравана 78 кандыдатаў. Удзельнікаў выбарчай кампаніі магло быць яшчэ больш, аднак гарадскі выбаркам адмовіў у рэгістрацыі сямі (з 16-ці вылучаных) сябрам Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) і аднаму прадстаўніку БНФ (усяго гэтая партыя вылучыла ў Брэсце 9 чалавек). Асноўная прычына адмовы ў рэгістрацыі – недакладныя звесткі ў дэкларацыі пра маёмасць і заробкі партыйных вылучэнцаў.

У Брэсцкай вобласці кандыдатамі зарэгістраваныя 32 сябры БНФ – ва ўсіх выбарчых участках рэгіёна. 13 зарэгістраваных кандыдатаў з'яўляюцца сябрамі БСДП (Грамада), 6 – Аб'яднанай грамадзянскай партыі.

У Гомельскі абласны Савет ад Аб'яднанай грамадзянскай партыі балатуюцца 9 чалавек. З іх 6 балатуюцца па выбарчых акругах Гомеля, 2 -- Жлобіна, 1 -- па выбарчай акрузе Буда-Кашалёва. Адмоўлена 3-м прэтэндэнтам ад АГП. Кандыдатам у дэпутаты Гомельскага гарадскога Савету зарэгістраваны адзіны прадстаўнік ПКБ, які не адклікаў сваю заяву. Таксама прайшлі рэгістрацыю па адным сябры Партыі БНФ і КХП-БНФ (дарэчы, гэтая партыя збіралася байкатаваць выбары).

Канчатковыя вынікі рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты будуць абвешчаныя 22 снежня.

Ні ў водную ўчастковую выбарчую камісію прадстаўнікі дэмакратычных партыяў не патрапілі. Між тым, як вядома, не важна, хто і як галасуе – важна, хто лічыць галасы.

### ЧЫМ СКОНЧЫЛІСЯ ПАПЯРЭДНІЯ ВЫБАРЫ Ў МЯСЦОВЫЯ САВЕТЫ

Паводле звестак Цэнтрвыбаркама, у выніку двух тураў выбараў 2003 году ў Беларусі былі абраныя 23 469 дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, ці 97,8 працэнта ад агульнай колькасці. Сярод дэпутатаў апынулася толькі 257 прадстаўнікоў палітычных партый, прычым больш чым 40 працэнтаў з іх — члены Камуністычнай партыі Беларусі, лаяльнай да кіраўніцтва краіны.

Апазіцыйныя партыі тады выступілі з рэзкай крытыкай мясцовых выбараў, заявілі аб іх недэмакратычнасці і масавых фальсіфікацыях. Беларускі Хельсінскі камітэт і іншыя праваабарончыя арганізацыі прызналі выбары неадпаведнымі дэмакратычным стандартам. Гісторыя паўтараецца?

**Аглядальнік**

# СЕАНС ШОКАВАЙ ТЭРАПІІ

## ХТО БУДЗЕ Ў РОЛІ ПАЦЫЕНТАЎ?

Візіт Аляксандра Лукашэнкі ў Маскву на мінулым тыдні скончыўся поўным правалам. Нават даўно запланаваны хакейны матч у лядовым палацы на Хадынскім полі з удзелам Лукашэнкі не адбыўся. Яму давялося спешна ляцець у Мінск, нават не пад'еўшы. Па прылёце кіраўнік дзяржавы гэтым разам не зрабіў аніякіх заяваў. Відавочна, не было аб чым казаць.




Мяркуючы па ўсім, кіраўніцтва Беларусі да апошняй хвіліны не верыла, што ад Расіі не ўдасца дамагчыся саступак – ні наконт мытаў на экспарт расійскай нафты, ні па коштах расійскага газа. Гэтым разам, выглядае, да кіраўніцтва дайшла ўся сур'ёзнасць сітуацыі…

Эксперт беларускага аналітычнага цэнтру «Стратэгія» Яраслаў Раманчук лічыць, што страты Беларусі ў выніку новай нафтавай палітыкі Расіі складуць каля 8% валавога ўнутранага прадукту (ВУП). Падаражанне газа можа прывесці да страты яшчэ 5% ВУП. Ураду давядзецца адшукаць яшчэ як мінімум 1 мільярд даляраў на закупку паліва ў ранейшых аб'ёмах. І гэта без уліку магчымага ўвядзення Масквой новых захадаў у абарону расійскага рынку ад беларускіх тавараў. На думку эканаміста, першымі ахвярамі могуць стаць дзяржаўныя інвестыцыі ў сельскую гаспадарку і будаўніцтва жылля, а потым пачнецца скарачэнне фінансавання і ў сферы прамысловасці. Ва ўмовах росту цэнаў на энерганосьбіты, камунальныя паслугі і транспарт ва ўраду не хопіць грошай на павышэнне пенсіяў. Шмат гадоў дзяржава праядала расійскія датацыі, і цяпер унутраных крыніц для нейтралізацыі шоку ў Мінска няма.

Але й гэта яшчэ не ўсё. На гэтым тыдні Канада заявіла пра ўвядзенне эканамічных санкцыяў у сувязі з тым, што ўлады Беларусі "ўпарта парушаюць правы чалавека". Еўрасаюз пагражае пазбавіць Беларусь прэферэнцыяў за сістэматычны перaслед незалежных прафсаюзаў.

Ціск на афіцыйны Мінск, як бачым, неймаверна ўзрастае і з Захаду, і з Усходу.

На першы погляд, дзіўная сітуацыя. Калі на Захадзе, паводле беларускай прапаганды, кіруюць пераважна нашы ворагі, дык іх дзеянні цалкам зразумелыя. Але чаму такім самым чынам паводзяць сябе "браты" з Расіі?

Калі разбірацца глыбей, высветліцца яшчэ адна цікавая рэч. Прэтэнзіі Захаду тычацца выключна таго, што ўлады нашай краіны парушаюць правы беларусаў. Менавіта з-за гэтага дзейны старшыня Еўрасаюза, прэм'ер-міністр Фінляндыі Маты Ванханен назваў Беларусь "шнарам на твары Еўропы". У выпадку ж, калі гэтая практыка спыніцца, ЕС наадварот, гарантуе беларусам шматлікія льготы.

Іншая справа – Расія. Яе наогул не хвалюе стан дэмакратыі ў Беларусі. Патрабаванні Крамля простыя: аддайце нам кантроль над краінай. Спярша праз эканоміку – таму расійцы дамагаюцца продажу ім "Белтрансгаза". А потым – праз адзіную валюту, Канстытуцыйны акт і наогул аб'яднанне ў так званую "саюзную дзяржаву".

Праўду кажучы, Крэмль патрабуе таго, што яму даўно было абяцана. Яшчэ напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2001 году ў Беларусі да кіраўніка дзяржавы прыязджалі расійскія алігархі, якім былі абяцаныя найсмачнейшыя кавалкі прамысловасці ў абмен на палітычную падтрымку Масквы. Натуральна, што Крэмль зрабіў стаўку на Лукашэнку, але за пяць наступных год так і не здолеў атрымаць ганарар. Перад кампаніяй 2006 году Лукашэнка зноў распавядаў Маскве байку пра белага бычка. Там сцялі сківаіцы, але зноў падтрымалі свайго заклятага сябра. У тым ліку, смешным коштам на газ – менш за 47 даляраў за тысячу кубаметраў.

Але навучаныя горкім досведам расійцы выставілі хаўрусніку рахунак адразу пасля "элегантнай перамогі". Ужо напрыканцы сакавіка "Газпром" абвясціў пра намер у некалькі разоў падвысіць кошт на газ для Беларусі.

Што далей? Многія аналітыкі мяркуюць, што цяпер на кон пастаўленая незалежнасць нашай краіны.

Але наўрад ці Лукашэнка пойдзе на гэта. Урэшце, у ягоных руках застаюцца амаль усе беларускія СМІ. Так што ён можа выбраць наступную тактыку – заклікаць беларусаў зацягнуць паясы і супраціўляцца ціску Масквы. Магчымы і поўны разрыў саюзніцкіх адносінаў.

А вось для эканомікі застаюцца, бадай, толькі два варыянты развіцця. Альбо яшчэ большая самаізаляцыя ва ўмовах яшчэ больш жорсткага адміністратыўнага рэгулявання – прасцей кажучы, шлях Паўночнай Карэі. Альбо – эканамічныя рэформы і пераход на зусім іншы этап развіцця, паводле прыкладу нашых заходніх суседзяў. Дык можа, гісторыя дае нам яшчэ адзін шанец?

**Алег Ман,**
**Валеры Філін**

**КАЛІ Ў ВАС НЯМА ІНТЭРНЭТУ, А ВЫ ХОЧАЦЕ РЭГУЛЯРНА АТРЫМЛІВАЦЬ ПАПЯРОВУЮ ВЕРСІЮ "СВАБОДЫ" ПРАЗ ПОШТУ, ДАШЛІЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, ВАШ АДРАС SMS-ПАВЕДАМЛЕННЕМ НА НУМАР:**
**+370 687 42 185**
**(КОШТ SMS-ПАВЕДАМЛЕННЯ – 150 БЕЛАРУСКІХ РУБЛЁЎ).**
**ВАШ АДРАС БУДЗЕ ВЯДОМЫ ТОЛЬКІ РЭДАКЦЫІ І ТОЛЬКІ ДЛЯ ПАДПІСКІ**

Саюздрук

# НАРОДЖАНЫЯ ЦЕЛААХОЎНІКАМІ

## АЛЬБО "У ДЗЕВАК, ЯК У МАІ, НЕ ПАПРОСІШ"

Напярэдадні Дня чэкіста газета "7 Дней" змясціла захапляльную гутарку з генерал-маёрам КГБ Валерыем Вялічкам, былым начальнікам штаба ўрадавай аховы. Ён прыадчыніў таямніцы свайго рамяства.

*" – … Откуда берутся охранники?*

*— Под моим началом работало много потомственных охранников. Так что в некотором смысле телохранителями рождаются. Система подбора кадров на эту службу во всех странах, по сути, одинакова. Охранник подбирается под шефа… Охранник – это и телохранитель, и мамка, и нянька.*

*Если шеф любит охоту, значит, охранник должен уметь и тушку разделать, и шашлык приготовить.*

*— Вы написали книгу, где проанализировали развитие правительственной охраны от Ивана Грозного до Горбачева. Кто, на ваш взгляд, из глав российско-советского государства охранялся наиболее трепетно и эффективно?*

*— Я считаю, что таковыми были Николай II и Сталин".*

Калі Лукашэнку ахоўваюць гэтак жа "трепетно", як Мікалая другога і Сталіна, дык яму можна толькі паспачуваць. Зрэшты, як вынікае з тэксту, галоўная задача ахоўніка – быць нянькай і мамкай. Спадзяюся, галоўны дарадца кіраўніка дзяржавы можа і ў хакей згуляць, і на баяне мяхі парваць і вершык Быкава на ноч прачытаць.

А "Советской Белоруссии" ўдалося ўзяць інтэрв'ю ў самага любімага пісьменніка цяперашняй улады Мікалая Чаргінца.

*"За последнее десятилетие произошел спад в белорусской литературе. Нет ни новых имен, ни новых литературных явлений. Умерли Максим Танк, Янка Брыль, Васиіь Быков, Иван Шамякин, а новых имен, которые могли бы достойно звучать в мировом масштабе, нет. При этом часть писателей занялась не своим делом – политикой. И мы хотим восполнить этот пробел, нельзя же не замечать новые ростки таланта. Есть и маститые писатели, которых раньше не «пущали», например, поэт Анатолий Аврутин, он признан одним из лучших русскоязычных поэтов в России, получили там признание. А в Беларуси его ни разу не издавали. Или писатель Георгий Марчук. Ему 30 декабря исполняется 60 лет. По-настоящему он так и не реализовал свой талант – не потому, что плохой писатель, а потому, что прежний Союз писателей никого не видел, кроме себя. Наша задача – помочь таким людям".*

Во як, спадарства! Але засталіся пасля Быкава з Брылём толькі тры волаты – Аўруцін, Марчук і Чаргінец. Цікава, а ці памятае заступнік за беларускую літаратуру, што ў свой час ні Шамякін, ні Брыль, ні Навуменка не пажадалі пакідаць законны Саюз пісьменнікаў і ўдзельнічаць у расколе? І што менавіта ў Саюзе беларускіх пісьменнікаў застаюцца Барадулін, Гілевіч, іншыя класікі беларускай (а не рускамоўнай) паэзіі?

Пра тых, каму Чаргінец збіраецца дапамагаць станавіцца на ногі, можна прачытаць у "Звяздзе", у артыкуле паэта Вячаслава Дашкевіча.

*"Дзякуючы прафесійнаму адбору прыстойныя выданні абы-што не друкуюць. Непакоіць іншае. Нашэсце «самапальных» творцаў. Яны выдаюць сваю пісаніну не толькі за ўласныя грошы, але вельмі часта знаходзяць спонсараў сярод паасобных кіраўнікоў дзяржаўных устаноў і прадпрыемстваў. «У правінцыі, — піша С. Грышкевіч («ЛіМ», 8 снежня г.г.), — графаманаў больш, чым камароў на ўрадлівых палескіх балотах... Вось, скажам, берасцейскі паэт-«самародак» з членскім білетам С. за два апошнія гады выдаў дзве шыкоўна аформленыя кнігі альбомнага фармату агульным накладам звыш 10 тысяч (!) асобнікаў. Удалы камерцыйны праект С. аформіў у выглядзе лірычна-вытворчых паэм пра двух мясцовых старшынь сельскагаспадарчай нівы. Выдаў — ну і добра. Але навошта аўтару трубіць па ўсёй вобласці аб годным мастацкім узроўні таго, што назваць літаратурай нельга пры ўсім жаданні, і «запіхваць» праз абласную «вертыкаль» сваю «каштоўную» прадукцыю ў бібліятэкі?"...*

*А што ў сталіцы? Радкі з кнігі вершаў, выдадзенай «Беллітфондам» у 2006 годзе: «Зноў прыйшла ды ў госці восень, У дзевак, як у маі, не папросіш, падмаўляй — не падмаўляй, Бывай любоў, чароўны май"… …Думаю, што варта стварыць пры двух (менавіта двух — для пошукаў згоды і паразумення!) дзеючых Саюзах пісьменнікаў Камісію па этыцы, якая б стрымлівала прыём у Саюзы апантаных «літаратурай» людзей. Экспертныя заключэнні камісіі сталі б сітам і пры рассылцы падобных «шэдэўраў» у бібліятэкі рэспублікі".*

Нават чытаць такое няёмка. Я не пра цытаты, а пра душэўныя кіданні Вячаслава Дашкевіча. Здаецца, дарослы чалавек, а простых рэчаў не разумее. Можа, яму растлумачыў бы нехта на ўнутранай камісіі па этыцы, што "у дзевак, як у маі..." – гэта паэзія. А "Магутны Божа", напрыклад – гэта палітыка.

**Алесь Канюціч**

Як робяцца хвалі

# "ПАЛЯГЧАЛА?"

## АЛЬБО ДЗЯЛКА, НА ЯКОЙ МОЖНА ПЕРАМАГАЦЬ

Па нядзелях на Радыё Свабода выходзіць перадача "Званкі на Свабоду", агляд за тыдзень. Калі гэтыя званкі гучаць сярод тыдня – дык яшчэ цярпець можна. Але ці варта гэта яшчэ паўтараць? Мне, напрыклад, гэты тыдзень запоўніўся галасамі. Бацька Змітра Дашкевіча расказваў, як прабіўся да суддзі і папрасіў паглядзець яму ў вочы. "Палягчала?" – цынічна запытаўся суддзя... А другі чалавек, які выступаў на "Свабодзе", Эрнэст Сабіла, так шчыра шкадаваў, што Фронт раскалоўся, і прасіў, каб Пазьняк і Вячорка сустрэліся на яго, Эрнэставых хаўтурах ды памірыліся. Вось гэтыя галасы – каштоўныя дакументы гісторыі. І такія галасы варта паўтараць, каб пачулі іх.

Маё вуха ветэрана "Талакі" чуйна рэагуе на інфармацыю пра ахову помнікаў. Нядаўна ў навінах нашых радыястанцый прамільгнулі такія паведамленні. У Глыбокім падчас рэстаўрацыі царквы знайшліся фрэскі каталіцкага касцёла, якія месціўся там раней. У Магілёве на замчышчы надумалі будаваць царкву. У Гальшанах з кляштара францішканаў выкідаюць музей. Мясцовыя краязнаўцы паўсюль хвалююцца – што будзе з фрэскамі, як захаваць замчышча, ці будзе новае памяшканне для музея? І наогул – каму ён пашкодзіў у кляшторным будынку? З кароткіх паведамленняў у выпусках навін нічога гэтага не дазнаешся. А калі б журналісты ўзяліся ды зрабілі расследаванні, дык і краязнаўцам дапамаглі б, і слухачам стала ўсё зразумела. Мне здаецца, ахова помнікаў – тая дзялка, дзе ўсе мы, неабыякавыя свядомыя беларусы, можам атрымліваць перамогу.

Моўныя заўвагі – у выглядзе шырока вядомага анекдота.

— Мікола, ты чуў, як Галляш Валынец з Еўрапейскага Радыё называе наша піва?

— Як?

— Піўко.

— ...!!!

А калі сур'ёзна, як назваць ласкава нашае піва? Піўка, піўца, піўцо.

**Сяржук Вітушка**

# ПОМНІК ЧЫКАЦІЛУ

## МАБЫЦЬ, ІСНУЕ НЕЙКІ ГЕН РАБСТВА

### Стрэмкі

“Узяўшы і разрабаваўшы гарады Харэзма, манголы ўчынілі нябачаную разню. Персідскі храніст Джувейні паведамляе пра мільён забітых у адным Ургенчы, іншыя аўтары пішуць пра некалькі мільёнаў... Манголы метадычна забівалі гараджан са спрытам жывёлаводаў, што прывыклі рэзаць авечак... Загінула не менш за чвэрць насельніцтва Харэзму. Як пісаў французскі вучоны Рэнэ Грусэ, Чынгісхан першым “узвёў тэрор у сістэму кіравання, а разню насельніцтва ў метадычны інстытут”. (Г.Казлоў, “Цемучын – карнік неразумных”.)

Сёлета спаўняецца 800 гадоў ад пачатку заваёўніцкіх паходаў Чынгісхана (Цемучына). Манголы, якія таксама хочуць людзьмі звацца, і не абы якімі, а нашчадкамі славутых ваяроў, абвясцілі Чынгісхана “чалавекам тысячагоддзя”. Урачыстасці працягваюцца ўвесь год, закладзены 40-метровы помнік вялікаму хану ва Ўлан-Батары...

Аляксандр Македонскі, Чынгісхан, Тамерлан, Напалеон... Усіх іх аб’ядноўвае маніякальная прага да заваявання чужых земляў. І вынікам іхняй дзейнасці былі спаленыя гарады і вёскі, зруйнаваныя палацы і храмы, і, вядома, горы і горы трупаў. Славутая карціна Верашчагіна “Апафеоз вайны” з выяваю пірамiды чарапоў – не фантазія мастака. Такімі “знакамі” Тамерлан пазначаў межы сваёй імперыі.

І ўсе вышэйпамянёныя асобы – што называецца, культавыя, кожным ганарац ца землякі, ушаноўваюць памяць, узводзяць помнікі і мемарыялы, іхнія асабістыя рэчы беражліва захоўваюцца ў музеях...

А цікава – праз колькі гадоў: сто, дзвесце? – будзе пастаўлены помнік Гітлеру? Сапраўды, чым ён горшы за Чынгісхана – хіба ж вялікі мангол адмовіўся б ад выкарыстання газавых камераў, калі б яны былі тады вынайдзены?

А верагоднасць стварэння такога помніка ёсць – гітлераўскія ідэі калі яшчэ й не перамагаюць, то, бясспрэчна, — жывуць. Нядаўна па польскім ТБ паказалі нейкую “тусоўку” польскіх неафашыстаў, якія скакалі каля палымнеючай свастыкі з крыкамі “Зіг хайль!”. Падумаць толькі – у Польшчы! Дзе, здавалася б, попел Варшавы павінен “грукаць у сэрца” кожнага паляка... А колькі гэткіх асобнікаў у Расіі? Што здзіўляцца: вось піша расійскі публіцыст Ул.Карпец у “Литературной газете”: фашызм, маўляў, усяго толькі “карпаратыўна-сацыяльны лад з аб’яднаным прадстаўніцтвам працоўных і прадпрымальнікаў пад кіраўніцтвам адзяржаўленай партыі”, і трэба спакойна ставіцца да гэтага паняцця. Нічога новага – у Беларусі адна да аскоміны вядомая асоба таксама сцвярджала, што не ўсё пры Гітлеры было кепска.

Не траціць шанцаў вярнуцца на п’едэсталы й найбольш нам “блізкі” душагуб – Сталін. Ужо існуе “лінія Сталіна” з азгураўскім бюстам, а ў кожнай кнігарні поўна кніг з панегірыкамі на адрас “бацькі народаў”. А адзін з самых нялюдскіх ягоных маршалаў – Жукаў – цяпер красуецца ў бронзе на Краснай плошчы ў Маскве.

Мабыць, існуе нейкі ген рабства, халопства, які змушае ахвяру абагаўляць ката...

А вось маньяку Чыкацілу помнік “не свеціць” – звёў са свету ўсяго некалькі дзясяткаў чалавек, не спаліў і не зруйнаваў аніводнай нават самай мізэрнай халупы... Вось калі б яму ўдалося ўзвесці лік сваіх ахвяраў у квадрат, потым яшчэ раз і яшчэ, ды падмацаваць гэта “самай передавой ідэалогіяй”!..

І тады б не зводзіліся кветкі ля помніка Чыкацілу І-му!

**Алег Аблажэй**

## ФОТАФАКТ



**Снегапад. Мінск,** *20 снежня 2006 году.*

# Невядомая Беларусь

**23 снежня** 1937 году старшыня Мінскага гарвыканкаму Ванееў падпісавае новыя «Правілы карыстання трамваем». Гэта быў самы страшны год сталінскага генацыду – ішлі татальныя арышты “ворагаў народу”. І гэта наклала свой адбітак на новыя правілы. У прыватнасці, забараняўся праезд асобаў з вінтоўкамі, а таксама – канвою з арыштаванымі. Выходзіць, што да новых правілаў “ворагаў народу” вазілі па Мінску не толькі ў “варанках”, але і ў звычайным трамваі.

**25 снежня** 1979 году ў цэнтры Мінска міліцыя разагнала першую Калядную працэсію, якую наладзілі студэнты з Беларускай Майстроўні – арганізацыі, што стане пачаткам усяго арганізаванага адраджэнскага руху ў паваеннай Беларусі.

**26 снежня** 1926 году выйшаў на экраны першы беларускі мастацкі фільм “Лясная быль”. Зняў яго кінарэжысёр Юры Тарыч паводле аповесці Міхася Чарота “Свінапас”. Цікава, што рабіліся першыя беларускія фільмы ў Расіі, у тагачасным Ленінградзе – пабеларуску. Калі ж кінастудыя перабралася ў Беларусь, у Мінск, фільмы пачалі здымаць і цяпер здымаюць пераважна па-расійску.

**29 снежня** 1961 году дала першы прамысловы ток Бярозаўская ДРЭС. Менавіта з будаўніцтвам гэтай электрастанцыі звязанае ўзнікненьне гораду энергетыкаў Белаазёрску.

**30 снежня** 1842 году ў дачыненні да Беларусі ўпершыню быў ужыты расійскі імперскі тэрмін “Северо-Западный край”. Дагэтуль землі, на якіх жылі нашы продкі, называлі Літвой. Аднак пасля далучэння гэтых земляў да Расіі спатрэбілася сцерці з памяці народу веды пра колішнюю самастойнасць і незалежнасць Вялікага Княства Літоўскага. Таму і з’явілася назва “Северо-Западный край”. Цікава, што з прыходам да ўлады бальшавікоў гэты тэрмін ператварыўся ў яшчэ больш заніжаны –“Северо-Западная область”.

Блакітны агеньчык

# БЫВАЙЦЕ ЗДАРОВЫ!

## “ОБЩЕНАЦИОНАЛЬНОЕ ТЕЛЕВИДЕНИЕ” ЗАСТАЛОСЯ НАСКРОЗЬ САВЕЦКІМ

100-гадовы юбілей Брэжнева шырока асвятляўся на ўсіх тэлеканалах. У сувязі з гэтым успамінаецца анекдот брэжнеўскай эпохі. “Тата! — пытаецца ў савецкага палкоўніка КГБ сын-школьнік, – Дык ці быў 1937-ы год у гісторыі нашай краіны? – Не, сынку, не быў. Але будзе”.

Гэты жарт цалкам падыходзіць у якасці эпіграфа да дзесяцісерыйнага фільма “Советская Белоруссия», які дэманструецца другі тыдзень на канале ОНТ.

Прызнаць назву фільма арыгінальнай цяжка. І не толькі таму, што ў Беларусі выходзіць аднайменная прэзідэнцкая газета. “Советская Белоруссия” – так некалі называліся кіначасопісы, якія паказвалі за савецкім часам у кінатэатрах перад сеансамі мастацкіх фільмаў.

Ладна, калі б аўтары неабдымнага серыялу абмежаваліся задачай адрадзіць эстэтыку і стыль савецкага псеўдадакументальнага кіно. Але яны пакінулі некранутым і ягоны змест. Ніводнага новага кінакадра, фотаздымка, ці дакумента за ўвесь фільм. Яго аўтары паленаваліся, ці палічылі непатрэбным корпацца ў архівах. Яны проста вывалілі на экран, не паклапаціўшыся часам нават пра асэнсаваны мантаж, увесь “залаты запас” БССР-аўскай прапаганды.

Адзіным наватарствам стваральнікаў серыялу можна лічыць тое, што большасць кінасюжэтаў ранейшага часу агучваліся дыктарскім тэкстам на беларускай мове, а ў наш час беларускі артыст




www.belzhaba.com

і тэатральны рэжысёр Валеры Анісенка чытае тэкст у кадры і за кадрам выключна па-расійску. Але з пафасам, якому пазайздросцілі б многія савецкія дыктары.

Ёсць і яшчэ адна знаходка. У серыі пра 30-я гады мінулага стагоддзя, напрыклад, нельга было абысці тэму сталінскіх рэпрэсіяў. Таму гэтую далікатную тэму даручылі пракаментаваць цяперашняму начальніку службы інфармацыі і грамадскіх сувязяў КГБ таварышу Надтачаеву. Той праінфармаваў гледачоў, што ў той час улады змагаліся з “унутранай апазіцыяй”, якая супрацьстаяла тагачаснай “лініі партыі”. Коратка і ясна. Яшчэ ясней выказаўся нейкі гісторык, які заявіў, што ў Беларусі ў той час былі і “шкоднікі”, і “ворагі народа”. Ну, і “перагібы” былі, не без таго.

Для ілюстрацыі нам паказалі даўжэзныя фрагменты дакументальных фільмаў, знятых у 1980-90-я гады, пра камуністаў Чарвякова, Цішку Гартнага, і дзеяча КПЗБ Арэхву, якія сталі ахвярамі рэпрэсіяў. Праўда, чыіх рэпрэсіяў – застаецца не зусім ясным, паколькі ні тагачасных партыйных кіраўнікоў Беларусі, ні таварыша Сталіна нам не паказваюць. У гледача павінна стварыцца ўражанне, што рэпрэсіі закранулі толькі камуністаў. А беларускі народ у цэлым жыў, калі казаць словамі вядучага, нялёгкім, але радасным, паўнакроўным жыццём. Араў, працаваў на будоўлях камунізму, танчыў і спяваў. І толькі набліжэнне вайны псавала радасную карціну калгаснага жыцця.

У якасці прыкладу атмасферы ўздыму і энтузіязму аўтары паказваюць кадры сустрэчы з расійскімі пісьменнікамі, на якой чытаюць свае аптымістычныя вершы паэты Ціханаў і Уткін. Пра беларускіх паэтаў і празаікаў, якіх за тым часам расстрэльвалі, альбо адпраўлялі ў сталінскія лагеры ў Сібір дзясяткамі – ані слова.

У якасці ўзору росквіту тагачаснай беларускай паэзіі прапанаваная песня “Жывіце багата” на музыку Лобана і словы Русака. (Песня сапраўды папулярная. Але ўявіце, каб з усёй пасляваеннай расійскай паэзіі была пакінутая для нашчадкаў толькі… “Кацюша” Ісакоўскага.)

У адной з наступных серыяў – “Адраджэнне”, мы пачуем, як паэт Максім Танк чытае верш, што ўслаўляе Сталіна. Пабачым мы і партрэты “правадыра народаў”, які нясуць шчаслівыя беларускія хлебаробы і даяркі з брыгадзірамі. Ні аб якіх рэпрэсіях у гэтай серыі ўжо няма і гаворкі. Праўда, скрозь зубы згадваюцца праблемы з калектывізацыяй у Заходняй Беларусі. Не тое што працэс там зусім абыходзіўся без гвалту… Але, як успамінае нейкі прафесар, ягонага бацьку, напрыклад, тады злёгку папалохалі – выклікалі ў райвыканкам і сказалі: выбірай! Хочаш – уступай у калгас, а не хочаш – едзь у Сібір.

Як сказаў вядучы, такое тады было жыццё – савецкае. Такім, калі меркаваць паводле 10-серыйнай тэлеэпапеі, яно і засталося.

**Максім Пешкаў**

VILNIA.COM
ЧЫТАЙЦЕ, ДРУКУЙЦЕ, ДАЙЦЕ ПАЧЫТАЦЬ ІНШЫМ

**Заснавальнік** ТАА “Тут і цяпер” **Адрас** 220013 г. Менск, пл. Каліноўскага, 1-а
**Галоўны рэдактар** А. Уласаў (email: gazeta@tyt.by) **Тыраж** 299 экзэмпляраў